кампазітараў і ў выканальніцкім стылі музыкантаў кожнай краіны. Менталітэт з'яўляецца важным і магчыма самым галоўным фактарам ў фарміраванні нацыянальнай выканальніцкай школы.

*1. Мельнікаў А.* Характар і менталітэт беларусаў // Беларуская думка. — 1997. — № 7. — С. 103.
*2. Крамской И.Н.* Об искусстве. — М., 1988. — С. 40.
*3. Коченева И., Яковлева А.* Вокальный словарь. — Л., 1988. — С. 15.

**Г.М.Водчыц,**
*аспірантка кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры*

## ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ БЕЛАРУСКАГА ФАЛЬКЛОРУ Ў СУЧАСНЫМ ХАРЭАГРАФІЧНЫМ МАСТАЦТВЕ

На працягу амаль сямідзесяці гадоў існавання беларускай сцэнічнай харэаграфіі балетмайстры пастаянна звяртаюцца да фальклору як крыніцы для стварэння харэаграфічных твораў, што, па-першае, спрыяе ўзбагачэнню і ўзнаўленню арсенала выразных сродкаў нацыянальнай харэаграфіі і , па-другое, стымулюе творчы працэс, а таксама служыць захаванню беларускай нацыянальнай танцавальнай традыцыі. Таму, безумоўна, у даследаванні вельмі важна прасачыць, як адбываўся працэс інтэрпрэтацыі фальклору ў беларускай сцэнічнай харэаграфіі.

Змяненне ўмоў існавання традыцыйнага народнага танца і пачатак выкарыстання яго твораў у сцэнічнай практыцы беларускіх калектываў у 30-х гг. ХХ ст. выклікалі неабходнасць яго творчага пераасэнсавання і ўзнікнення спосабаў мастацкай апрацоўкі фальклорных твораў. У адрозненне ад фальклорнага ўзору сцэнічны танец арыентуецца на гледача і падпарадкоўваецца законам яго ўспрымання. Пры пераносе на сцэну традыцыйны танец

перабудоўваецца згодна законаў драматургічнага развіцця, становіцца больш дынамічным, выразныя харэаграфічныя сродкі пачынаюць несці большую эмацыянальную і сэнсавую нагрузку.

У далейшым усё большае кола фальклорных танцаў уключаецца ў працэс інтэрпрэтацыі, удасканальваюцца яе прыёмы. Вялікую ролю ў гэтым адыгралі станаўленне і развіццё беларускай кампазітарскай школы, творчая дзейнасць кампазітараў у галіне апрацоўкі традыцыйных беларускіх танцавальных мелодый, стварэнні сімфанічных твораў на іх аснове. У адпаведнасці з гэтым ускладніўся падыход да харэаграфіі. У пасляваенныя гады з'явілася новая тэндэнцыя, калі ў якасці музычнага суправаджэння сталі выкарыстоўваць творы папулярнай музыкі ў выкананні вакальна-інструментальных ансамбляў і эстрадных спевакоў, якія працуюць у галіне стылізацыі беларускай песні (такіх, як ансамбль "Песняры"). Змяніўся і ўзровень інтэрпрэтацыі харэаграфіі. З'явіўся шэраг стылізацый беларускіх танцаў. Для стварэння харэаграфіі гэтых твораў балетмайстры сталі выкарыстоўваць нетрадыцыйныя фальклорныя крыніцы, пераасэнсоўваць песенныя вобразы, народныя традыцыі. Такім чынам, быў зроблены вялікі крок наперад на шляху інтэрпрэтацыі беларускага фальклору.

Характэрнай рысай апошняй трэці XX ст. стаў працэс стварэння спецыяльнага дзіцячага рэпертуару, асноўным патрабаваннем да якога стала адпаведнасць асаблівасцям псіхалогіі ўспрымання дзецьмі харэаграфічных твораў. Пачынаецца пераасэнсаванне пласта дзіцячага фальклору: балетмайстры звяртаюцца да казачных вобразаў, гульняў, выкарыстоўваюць іх у якасці крыніц для стварэння твораў рэпертуараў дзіцячых калектываў.

Наватарствам, якое атрымала развіццё ў канцы XX ст., стаў больш часты зварот да выкарыстання выразных сродкаў іншых пластычных сістэм, у першую чаргу класічнага і эстраднага танцаў, а таксама элементаў сучаснай харэаграфіі (джаз-танца і мадэрн-танца). Такое



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спалучэнне развівае лексічны арсенал беларускага танца і набліжае яго да сучаснага гледача. Ужываецца таксама мноства складаных тэхнічных і трукавых элементаў, якія назапашаны за гады існавання жанру сцэнічнага танца. Сёння немагчыма ўявіць выступленне калектыву без дэманстрацыі яго ўдзельнікамі фізічнай спрытнасці ў так званых мужчынскіх нумарах, часам нічым не апраўданай. Найбольш лагічна, на наш погляд, трукавыя элементы выглядаюць у тых выпадках, калі яны нясуць вобразную нагрузку, нейкім чынам характарызуюць герояў. Як прыклад можна адзначыць "Танец брадзячых акцёраў" у праграме ансамбля танца "Харошкі" па старонках "Полацкага сшытка". Тут мноства акрабатычных элементаў служаць для стварэння вобраза незалежных і вясёлых людзей, для якіх галоўны сэнс жыцця заключаецца ў тым, каб несці людзям радасць.

Такім чынам, мы вызначылі некаторыя асаблівасці, якія характарызуюць сучасны стан праблемы інтэрпрэтацыі беларускага фальклору ў харэаграфічных калектывах. Але нельга абысці увагай негатыўныя тэндэнцыі, якія ўсё часцей тут праяўляюцца. Гэта, па-першае, нежаданне многіх балетмайстраў шукаць новыя харэаграфічныя формы і новыя сродкі іх увасаблення. Па-другое, з'яўленне вялікай колькасці нумароў, якія наогул не маюць фальклорных першакрыніц і змайстраваны па прынцыпе простага спалучэння элементаў народна-сцэнічнага танца (часам небеларускага). Назіраецца таксама працэс шырокага распаўсюджвання сцэнічных штампаў, калі харэаграфічны твор прымаецца як узор і паўтараецца ў іншых калектывах або танцы пераносяцца з аднаго ансамбля ў другі самімі пастаноўшчыкамі. І таму праграмы калектываў становяцца падобнымі. Гэта адбываецца і тады, калі харэографы выкарыстоўваюць стандартныя прыёмы пабудовы канцэртнай праграмы або нумара.

Пераадоленне гэтых недахопаў, а таксама творчы пошук новых прыёмаў і ўзораў для інтэрпрэтацыі фальклору забяспечаць новы ўзровень існавання



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

беларускай сцэнічнай харэаграфіі, як прафесійнай, так і аматарскай.

Ужыванне спосабу мастацкай інтэрпрэтацыі фальклорных узораў садзейнічае захаванню найбольш яркіх, характэрных рыс беларускай харэаграфічнай традыцыі, дазваляе ажыццявіць шматварыянтны падыход да канкрэтнага фальклорнага ўзору і стварыць вялікую колькасць разнапланавых твораў з улікам спецыфікі калектыву і ў залежнасці ад індывідуальнасці балетмайстра.

**І.Б.Вышынская,**
*аспірантка кафедры*
*сацыялогіі і культуразнаўства*

## ФАРМІРАВАННЕ АСОБЫ БУДУЧАГА СПЕЦЫЯЛІСТА Ў СІСТЭМЕ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ

Культура з'яўляецца мерай гуманізму грамадства, яго чалавечнасці. Тое грамадства знаходзіцца на больш высокім узроўні культурнага развіцця, дзе кожны індывід набывае рысы цэласнай, гарманічна развітой асобы і мае магчымасць удасканаліць і развіць сваю індывідуальнасць.

У цяперашні час намецілася тэндэнцыя да змянення асноў светапогляду. Гэта звязана з распадам тэхнагеннай культуры, што і зрабіла ўплыў на ўсе сістэмы грамадства, уключаючы адукацыю. У новых сацыяльных умовах складваецца новая канцэпцыя выхавання, адным з метадалагічных асноў якой з'яўляецца прынцып гуманітарызацыі адукацыі.

У канцы XX ст. сфарміраваўся новы тып людзей — вузкіх спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, прафесіяналаў у сваёй працы. Уласцівае ім тэхнакратычнае мысленне ўяўляе сабой светапогляд, для якога прыватная мэта важнейшая за агульначалавечыя інтарэсы, тэхніка найважней чалавека і яго каштоўнасцей, што часцей за ўсё прыводзіць да разбуральных з'яў у экалогіі, здароўі чалавека, маральнасці.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ